http://edoc.bseu.by:8080

# КАТЭГОРЫЯ «СВАБОДЫ» У ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XVI—XVII стст.

*І. У. Вішнеўская,*
*канд. гіст. навук, дацэнт*

Грамадска-палітычная, прававая, філасофская думка на землях Беларусі ў XVI—XVII стст. развівалася пад уздзеяннем ідэалогіі рэнесансавага гуманізму і рэфармацыі. Асноўнымі іх прынцыпамі, якія паўплывалі на фарміраванне буржуазнага светапогляду, былі антрапацэнтрызм, натуралізм (тэорыя натуральнага права), свабода, незалежнасць рэлігійных перакананняў.

Нягледзячы на тое, што ў айчыннай адраджэнчаскай думцы прынцып індывідуальнай свабоды чалавека не атрымаў усебаковага развіцця, асэнсаванне катэгорыі «свабоды» мела месца ў творчасці большасці рэнесансавых мысліцеляў Беларусі.

У адпаведнасці з гуманістычнай традыцыяй «свабода» імі разглядалася як мера магчымасцей чалавека ў яго адносінах да свету, грамадства, творчасці, пазнання.

Значна пашырыў межы духоўна-маральнай прыроды чалавека Францыск Скарына. Ён абвясціў права чалавека на адносна незалежнае тлумачэнне біблейскіх тэкстаў, на разуменне боскага слова і праз гэта — індывідуальнае ўдасканаленне без пасрэдніцтва царквы. Мысліцель бачыў свабоду чалавека ў праве на пазнанне і творчасць, сцвярджаў магчымасць і нават неабходнасць умяшальніцтва чалавека ў існуючую грамадскую рэчаіснасць, актыўных адносін да яе. Разам з тым, ідэя духоўнай свабоды суадносіцца ў Ф. Скарыны з ідэяй «агульнага дабра» — самаахвярнага служэння Айчыне, свайму народу.

Славуты беларускі правазнаўца Андрэй Волан катэгорыю «свабоды» напаўняў прававым сэнсам. Ён лічыў свабодным такое грамадства, у якім закон і дзяржава гарантуюць чалавеку асабістую бяспеку і недатыкальнасць прыватнай уласнасці, інакш кажучы, ахоўваюць яго натуральныя неадуемныя правы. У сваім творы «Пра палітычную і грамадзянскую свабоду» А. Волан падкрэсліваў, што свабоднай трэба лічыць такую дзяржаву дзе «...права ў роўнай ступені служыць усім» [1, с. 89].

Аналагічнае вызначэнне паняцця «свабода» даваў і канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега. У «Прадмове» да Статута 1588 г. ён падкрэсліваў, што сутнасць свабоды складаюць неадчужальныя (натуральныя) правы на ўласнасць, асабістую

і маёмасную недатыкальнасць, абарону гонару і годнасці, с боды рэлігійнага і палітычнага выбару. Гэтыя правы, на ду ку Л. Сапегі, павінны быць замацаваны заканадаўча і забясі чаны дзяржавай. Калі ў грамадстве адсутнічае павага да п ва, пісаў Л. Сапега, а пануе свавольства і беззаконне, яно можа лічыцца чалавечым, а робіцца подобным на «звярын зграю». Такім чынам, у славутага мысліцеля і палітычнага д яча менавіта закон зўяўляецца той мяжой, да якой распаўс джваецца свабода чалавека. Чалавек, які ведае законы, па крэсліваў Л. Сапега, стрымлівае сябе ў сваіх учынках, нікога крыўдзіць, а «калі б сам кім быў пакрыўджаны» не займаец самасудам, а «абарону і лекі ад крыўды сваей» шукае ў закон судзе [2, с. 102].

Як талерантны палітык і прыхільнік верацярпімасці Л. С пега падтрымліваў утварэнне уніяцкай царквы на Беларусі, а быў катэгарычным праціўнікам гвалту і насілля, як сродкаў я ўмацавання. Будучы ўпэўненным у тым, што рэлігійнае адзі ства спрыяла б умацаванню дзяржавы і пазбавіла б яе ад многі унутраных канфліктаў, ён, тым не менш, настойваў на тым што законным можа быць толькі свабоднае волевыяўленне. На ват сам Бог «не прымае слуг, якіх яму дастаўляюць сілай», – пісаў канцлер ВКЛ Л. Сапега ў лісце да ўніяцкага епіскап І. Кунцэвіча [3, с. 76].

Як бачым, вышэй названыя беларускія мысліцелі пры трымліваліся памяркоўных падыходаў да вызначэння мяжа асабістай свабоды чалавека. На іх думку, чалавек можа лічыц ца свабодным ва ўмовах рэлігійнай, прававой і палітычнай роўнасці.

У адрозненні ад памяркоўных мысліцеляў левыя арыяне (адзін з напрамкаў рэфармацыйнай ідэалогіі) асабістую свабоду чалавека бачылі толькі ва ўмовах сацыяльнай роўнасці. Іх ідэолагі — Петр Гезка, Марцін Чаховіц, Павел з Візны, Лаўрэнцій Крышкоўскі заклікалі ліквідаваць сацыяльную і маёмасную няроўнасць, падзяліць дабро багатых паміж беднымі, расфарміраваць усе дзяржаўныя інстытуты, знішчыць органы ўлады, суд і войска. У якасці эталону арганізацыі сацыяльнага жыцця ім бачылася першахрысціянская абшчына, дзе ўсе былі роўныя і свабодныя.

У 60-х гг. XVI ст. у палітыка-прававой думцы Беларусі ішла дыскусія аб прынцыпах саюза ВКЛ з Польскай Каронай. У творах польскіх і беларускіх палемістаў таксама ўздымалася праблема грамадзянскай свабоды. Прыхільнік прапольскай арыентацыі беларускі шляхціч Станіслаў Ажахоўскі ў творы «Піра-

міды» свабоду грамадзяніна ставіў у залежнасць ад формы дзяржавы, у якой ён жыве. Аўтар сцвяржаў, што ўсе дзяржавы-княствы — гэта дэспатыі, дзе жыхары жывуць у няволі і жабрацтве. «Кожны чалавек у княстве — гэта толькі цень чалавека, а не сапраўдны чалавек», — падкрэсліваў ён [4, с. 72]. Таму, на думку С. Ажахоўскага, літвіны — нявольнікі, над якімі пануе вялікі князь. І адзіны сродак выратавання і выйсця з грамадскай няволі — гэта унія з Польшчай на любых умовах.

Асноўныя палажэнні «Пірамід» былі падвержаны крытыцы выдатным літоўскім правазнаўцам, адным з стваральнікаў Статуту 1566 г., Аўгусцінам Ротундусам. Ён не пагаджаўся з тым, што свабода грамадзян краіны залежыць ад таго, хто імі кіруе — кароль або князь. А. Ротундус лічыў, што ўзровень свабоды вызначаецца такімі фактарамі, як палітычна-прававы рэжым, узровень заканадаўства краіны, характар унутранай і знешняй палітыкі, узаемаадносіны паміж суседзямі і, урэшце, гістарычныя традыцыі [4, с. 76].

З другой паловы XVI ст. ў ВКЛ пачынаецца наступ контррэфармацыі, якая мела на мэце аднаўленне манаполіі каталіцкай царквы і ўмацаванне феадальнага ладу. Замацаванне з дапамогаю дзяржаўнай улады пануючых пазіцый каталіцкай, а пасля Берасцейскага сабору і уніяцкай царквы выклікала негатыўную рэакцыю ў некаталіцкім асяроддзі. У палітычна-рэлігійнай палеміцы канца XVI—XVII стст. уздымалася пытанне палітычных і рэлігійных свабод, абмяркоўваліся мадэлі грамадскага ўладкавання, якія б садзейнічалі міру і згодзе паміж грамадзянамі краіны.

У літаратурнай палеміцы азначанага перыяду многія аўтары імкнуліся даць свае тлумачэнне катэгорыі «свабода». Буйнейшы ідэолаг контррэфармацыі езуіцкі прапаведнік Пётр Скарга выказваўся за мэтазгоднасць існуючай іерархічнай структуры, бо, на яго думку, «ніхто на свеце не нараджаецца вольным» і « ніжэйпастаўленыя павінны падпарадкоўвацца высокародным і высокапастаўленым» [5, с. 288—289]. Такім чынам, П. Скарга лічыў не свабоду, а падпарадкаванне асноўным стрыжням дзяржаўнага парадку. Свабода ж прызнавалася ім толькі ў трох відах: свабода ад граху, свабода ад падпарадкавання замежным уладарам і свабода ад тырана. З апошняй ён звязваў абмежаванне каралеўскай улады шляхецкай радай і заканадаўствам. «Статуты патрэбны кожнай дзяржаве, як вочы целу», — пісаў П. Скарга. Адмаўляў езуіцкі ідэолаг грамадзянам ВКЛ і ў праве на свабоду веравызнання. У «Соймавых казаннях» П. Скарга абвясціў акт Варшаўскай канфедэрацыі аб

верацярпімасці, які цалкам увайшоў у тэкст аднаго з артыкулаў Статуту 1588 г., выступленнем супраць усіх боскіх і чалавечых правоў, дзяржаўнага права, супраць натуральнага розуму і хрысціянскага высакародства, вытокам атэізму.

Такім чынам, П. Скарга адстойваў ідэю монацаркоўнай дзяржавы з пануючай каталіцкай канфесіяй.

У адрозненні ад П. Скаргі і іншых каталіцкіх і уніяцкіх ідэолагаў праваслаўныя ўдзельнікі рэлігійнай палемікі адстойвалі канцэпцыю «грамадскага дабра», пад якой разумелі ўсталяванне дзяржаўнага парадку, заснаванага на прававым рэгуляванні адносін паміж канфесіямі і забеспячэнні свабоды веравызнання.

У адпаведнасці з гуманістычнымі традыцыямі разглядваў паняцце «свабоды» лідэр праваслаўнай апазіцыі Мелецій Сматрыцкі. Свабода, на яго думку, гэта магчымасць абрання жаданага ладу жыцця, але толькі ў адпаведнасці з існуючым заканадаўствам. Імкненне да грамадзянскай свабоды прадугледжвае юрыдычнае падпарадкаванне ўладам. Паняццю «свабода» аўтарам надаваўся сацыяльна-палітычны сэнс.

Не тыповым для свайго часу быў падыход да праблемы палітычных і грамадзянскіх свабод у выдатнага правазнаўца першай паловы XVII ст. Аарона Алізароўскага. У кнізе «Пра палітычную супольнасць людзей» ен выказваўся за наданне прадстаўнікам усіх саслоўяў права карыстацца пэўным аб'ёмам грамадзянскіх і палітычных правоў. Прыгонную сістэму А. Алізароўскі лічыў супярэчнай натуральнаму праву і прапанаваў будаваць узаемаадносіны паміж панамі і сялянамі на аснове дагавору, які б прадугледжваў выплату чыншу за карыстанне зямлёй феадала і права свабоднага пераходу на новае месца жыхарства. Правазнаўца лічыў неабходным прызнаваць за грамадзянамі права на паўстанне супраць манарха і нават яго забойства ў тым выпадку, калі кароль пераўтвараецца ў тырана. Наогул, канцэпцыя свабоды і роўнасці ў Алізароўскага прадугадала падыходы асветнікаў XVIII ст. да вызначэння гэтых катэгорый. Свабоду вучоны ўяўляў у трох аспектах: прававым, пад якім ён разумеў здольнасць людзей будаваць сваё жыцце ў адпаведнасці з уласным разуменнем і патрабаваннямі закона; філасофскім, як улада розуму над эмоцыямі і пачуццямі; палітычным — панаванне ў грамадстве права і закону [6, с. 616].

Такім чынам, у беларускай палітыка-прававой думцы XVI—XVII стст. ідуць пошукі рацыяналістычных сродкаў асэнсавання рэчаіснасці. Такія пошукі садзейнічалі фарміраванню новага светапогляду, заснаванага на аб'ектыўным навуковым пазнанні.

Творчасць беларускіх мысліцеляў з'яўляецца пацверджаннем высокага еўрапейскага ўзроўню палітыка-прававой думкі Беларусі, наяўнасці ў ёй тэндэнцый, апераджаючых час.

**Літаратура**

1. *Падокшын С.А., Сокач С.Ф.* Палітычная і прававая думка Беларусі 16—17 стст. Мн., 1999.

2. *Шалькевіч В.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мн., 2002.

3. *Сапега Л.* Письмо...Юзафату Кунцевичу от 12 марта 1622 года // Памятники философ. мысли Белоруссии XVII—первой половины XVIII в. Мн., 1991. С. 76.

4. *Саверчанка І.* Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998.

5. *Skarga P.* Kasania Sejmove. Warsawa, 1912.

6. *Алізароўскі А.* Пра палітычную супольнасць людзей // Мысліцелі і асветнікі Беларусі X—XIX стст.: Энцыкл. дав. Мн., 1995.

## ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ Ў СЦЕНАХ БДЭУ

*В.І. Галубовіч, З.В. Шыбека,*
*кандыдаты гіст. навук,*
*прафесары*

Даволі вядома, што ў Беларусі як навука і вучэбная дысцыпліна існуе эканамічная гісторыя, але, акрамя спецыялістаў, мала каму зразумела, што гэта такое па сваей сутнасці. Хоць і выдадзены навуковыя працы, адпаведныя дапаможнікі, але яны чытаюцца пераважна навукоўцамі і студэнтамі. Таму і ўзнікла неабходнасць напісаць гэты артыкул, каб больш дакладна вызначыць месца эканамічнай гісторыі ў навучальна-выхаваўчым працэсе універсітэта, паказаць асноўныя этапы яе станаўлення і развіцця.

Эканамічная гісторыя належыць да гуманітарных навук і вывучае развіццё гаспадарчай дзейнасці людзей, вынікі іх дзейнасці і фактары, што ўплываюць на гэту дзейнасць. Прадметамі асобай зацікаўленасці гісторыка-эканаміста з'яўляюцца паходжанне і развіццё розных тыпаў гаспадаркі, а таксама эканамічныя трансфармацыі, якія адбываюцца ў канкрэтных сацыяльна-гістарычных умовах.

Эканамічная гісторыя зарадзілася на сумежжы двух навук — эканомікі і гісторыі. Спачатку гісторыка-эканамічныя